Голас Радзімы

№ 33 (1759)
19 жніўня 1982 г.

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ТАВАРЫСТВА ПА КУЛЬТУРНЫХ СУВЯЗЯХ З СУАЙЧЫННІКАМІ ЗА РУБЯЖОМ
(БЕЛАРУСКАЕ ТАВАРЫСТВА «РАДЗІМА»)

выдаецца з 1955 г.
Цана 4 кап.

Новыя жылыя дамы ў мікрараёне Зялёны Луг-5 у Мінску.

Фота Я. КАЗЮЛІ.

ЭКАНОМІЯ РЭСУРСАЎ ЗАБЯСПЕЧВАЕ ЗБЕРАЖЭННЕ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ ЗАПАСАЎ ПРЫРОДНЫХ БАГАЦЦЯЎ ДЛЯ БУДУЧЫХ ПАКАЛЕННЯЎ
[«Дарога да рэзерваў»] стар. 2

ЗДРАДНІК ЗАЎСЁДЫ І ЎСЮДЫ ЗАСТАЕЦЦА ЗДРАДНІКАМ
[«Рутман на «Свабодзе»] стар. 4—5

Здзіслаў СТОМА: ЗМАГАЦЦА ЗА ЛЕПШАЕ Ў ЧАЛАВЕКУ
[«Такім яго ведаюць, такім яго любяць»] стар. 6

падзеі · людзі · факты

ЗНАХОДЖАННЕ Ў РЭСПУБЛІЦЫ

З 9 па 12 жніўня ў Беларусі знаходзіўся намеснік Старшыні Савета Міністраў СССР Л. Кастандаў. Разам са Старшынёй Савета Міністраў БССР А. Аксёнавым, сакратаром ЦК КПБ Л. Фірысанавым і іншымі кіруючымі работнікамі рэспублікі ён наведаў Ганцавіцкі эксперыментальны кансервава-гароднінасушыльны комплекс, пабываў на гродзенскім вытворчым аб'яднанні «Азот», на магілёўскім аб'яднанні «Хімвалакно» і Магілёўскім вытворчым аб'яднанні шаўковых тканін, на будаўнічых пляцоўках Беларускага металургічнага завода ў горадзе Жлобіне, у вытворчым аб'яднанні «Беларуськалій».

У гутарках з рабочымі, спецыялістамі, кіраўнікамі абмяркоўваліся пытанні выканання рашэнняў XXVI з'езда КПСС, заданняў адзінаццатай пяцігодкі па павелічэнню выпуску і павышэнню якасці прадукцыі, праблема нарошчвання вытворчых магутнасцей, скарачэння тэрмінаў узвядзення аб'ектаў.

МЕТРАПАЛІТЭН

РЭЙКІ ВЫЦЯГНУТЫ Ў СТРУНЫ

На фінішную прамую выйшлі будаўнікі Мінскага метрапалітэна. Паміж станцыямі «Парк Чалюскінцаў» і «Маскоўская» пачалася ўкладка пастаянных рэйкавых пуцей. Улічваючы неглыбокае заляганне тунеляў, праекціроўшчыкі прадугледзелі стварэнне спецыяльных арматызуючых сродкаў для зніжэння ўзроўню вібрацыі і змяншэння шуму.

Да пуску мінскай падземкі, засталося менш двух гадоў. Мантажнікі перанялі паскораны рытм праходчыкаў і вырашылі пракладваць пуці адначасова з узвядзеннем і аддзелкай станцый. Ім трэба будзе з гранічнай дакладнасцю пабудаваць «ложа», а затым змяніраваць на ім больш як 20 кіламетраў рэек.

Мінскія метрабудаўцы вядуць цяпер праходку апошняга перагона ў цэнтры горада. Тунелі злучацца паміж сабой сёлетняй зімой ля падземнага «калідора» пад ракой Свіслач, дзе будзе прыменена замарожванне глебавых вод. На пяці станцыях з васьмі першай чаргі ідуць аддзелачныя работы.

ВЫВЕДЗЕНА БЕЛАРУСКІМІ ВУЧОНЫМІ

ПАРЭЧКІ — ДЛЯ СЯБРОЎ

Пройдзе час і, магчыма, Беларусь будуць называць краем гэтай цудоўнай ягады. Штогод у рэспубліканскі НДІ бульбаводства і плодаагароднінтва, дзе выведзены новыя сарты гэтай культуры, паштальён прыносіць сотні пісем вучоных і садаводаў-аматараў. Зацікавіўшыся вялікай ураджайнасцю і добрымі якасцямі беларускіх парэчак, яны просяць калег падзяліцца саджанцамі. Цяпер кусты іх можна ўбачыць у садах Украіны, Падмаскоўя, Прыбалтыкі, Сібіры. Засухаўстойлівы сорт «Паўлінка» раяніраван у Казахскай ССР. У Балгарыі, ГДР, Румыніі, Чэхаславакіі праходзяць сортавыпрабаванні «беларускіх салодкіх» і «кантаты». Праз Усесаюзны НДІ раслінаводства імя М. Вавілава адпраўлены саджанцы ў Індыю і Англію.

Геаграфія падарожжаў парэчкі працягвае расшырацца.

УВЕКАВЕЧАНА ІМЯ

ПАМЯЦІ ПАЭТА

Савет Міністраў Беларускай ССР прыняў пастанову аб увекавечанні памяці вядомага беларускага паэта Аляксея Пысіна. Імя Пысіна прысвоена Палужскай сярэдняй агульнаадукацыйнай школе Краснапольскага раёна. Вырашана выдаць збор твораў паэта, устанавіць мемарыяльную дошку на доме № 35-а па праспекту Міру ў Магілёве, у якім ён жыў.

МІНСКАЯ МАРКА

◆ Мінскі доследны механічны завод — галаўное прадпрыемства вытворчага аб'яднання «Будмаш» выробляе новыя высокапрадукцыйныя машыны і механізмы для комплекснай механізацыі працаёмкіх працэсаў у будаўніцтве, вядзе капітальны рамонт будаўнічай тэхнікі. Тут выпускаюць аўтаматызаваныя мабільныя змяшальныя ўстаноўкі МСУ-20, цэнтрыфугі для вытворчасці жалезабетонных труб, агрэгаты па аддзелцы фасадаў будынкаў, розныя грузападымальныя машыны і механізмы, грузазахопныя прыстасаванні і іншую будаўнічую тэхніку.

На прадпрыемстве вырабляюць таксама вузлы і запасныя часткі да кормаўборачных камбайнаў КСК-100 і элементы для камбайнаў па ўборцы палеглай збажыны.

◆ Мінскі завод халадзільнікаў выпусціў сямімільённы апарат. Імі можна забяспечыць усе сем'і Беларусі, Літвы, Латвіі і Эстоніі. Да першага мільёна завод ішоў дзевяць гадоў, да апошняга — менш чым паўтара года. Аб'яднаннем «Атлант», галаўным прадпрыемствам якога з'яўляецца мінскі завод, штогод выпускаецца звыш мільёна халадзільнікаў. Па традыцыі на заводзе юбілейныя апараты ўручаюць лепшым работнікам як прэмію за добрую працу. На гэты раз такі падарунак атрымала зваршчыца цэха пластмас Браніслава Данілевіч.

◆ Міні-будзільнікі размерам з запалкавы карабок упершыню ў краіне пачаў выпускаць Мінскі гадзіннікавы завод. Навінка спадабалася пакупнікам. Завод атрымаў ад магазінаў заказ на выпуск 500 тысяч штук.

ВЕСТКІ АДУСЮЛЬ

Спецыялізаваную аснастку для прадпрыемстваў станкабудаўнічай прамысловасці выпускае Баранавіцкі завод станкапрылад. Машынныя ціскі, паваротныя сталы, такарныя патроны, вузлы для станкоў з лічбавым і праграмным кіраваннем, выробленыя тут, пастаўляюцца ў многія саюзныя рэспублікі, экспартуюцца ў 55 замежных краін.

НА ЗДЫМКУ: участак зборкі паваротных сталоў для станкоў.

◆ Па пуцёўках спецыялізаванага турысцкага маршруту ў гонар 60-годдзя ўтварэння СССР з Мінскага аэрапорта ў Баку адправіліся пасланцы Гродзенскай вобласці. Такія маршруты праляглі ў Маскву і Ленінград, Рыгу і Талін, а да канца года будуць арганізаваны ва ўсе саюзныя рэспублікі. Пуцёўкі на такія паездкі атрымліваюць ветэраны, працоўная моладзь, студэнты.

◆ Прасторныя холы, угульная глядзельная зала са зручнай сцэнай, бібліятэка, танцавальная ляцоўка, кафэ, шматлікія пакоі для заняткаў гурткоў — усё гэта размясцілася пад дахам новага раённага Дома культуры ў Маларыце. Сучасны будынак вызначаецца арыгінальнасцю формы, акрэсленасцю ліній, стылёвай выразнасцю, аздоблены нацыянальным арнаментам, малюнкамі з жыцця сённяшняга беларускага Палесся, арыгінальнымі керамічнымі і металічнымі ўпрыгожаннямі.

СЕЛЬСКІЯ НАВІНЫ



Уборка збожжавых у гаспадарках Пухавіцкага раёна, як увогуле ў рэспубліцы, вядзецца сёлета раздзельным (збажына скошваецца ў валкі, а праз дзень, два абмалочваецца) і двухфазным (за жняркай услед ідуць камбайны і абмалочваюць валкі) спосабамі. Двухфазны спосаб дае магчымасць павялічыць прадукцыйнасць камбайна на 25—30 працэнтаў. На жніве ў раёне працуе 340 камбайнаў «Колас» і «Ніва», якімі будзе ўбрана 33 тысячы гектараў збожжавых.

НА ЗДЫМКУ: жніво ў калгасе «Сцяг камунізму».

ЧАМУ САВЕЦКІЯ ЭКАНАМІСТЫ ПАТРАБУЮЦЬ ПАВЫСІЦЬ КАЭФІЦЫЕНТ ВЫКАРЫСТАННЯ СЫРАВІНЫ Ў НАРОДНАЙ ГАСПАДАРЦЫ

ДАРОГА ДА РЭЗЕРВАЎ

У праграме развіцця народнай гаспадаркі Савецкага Саюза ў 80-я гады адзін з вядучых напрамкаў — эканомія сыравінных рэсурсаў.

Курс на эканомію сыравіны не савецкае вынаходства. Гэта праблема востра стаіць перад многімі краінамі. Але эканомяць звычайна тое, чаго не хапае. І калі лёгка зразумець, чым выклікана трывога амерыканскіх эканамістаў, падкрэсліваючых, што ЗША на 50—100 працэнтаў залежаць ад замежных крыніц атрымання як мінімум 23 з 40 важнейшых відаў сыравіны, то ў Савецкага Саюза становішча іншае. Ён не толькі дае чацвёртую частку сусветнай здабычы карысных выкапняў, практычна поўнасцю базіруючы на ёй развіццё ўласнай эканомікі, але добра забяспечаны рэсурсамі і на бліжэйшую перспектыву. Гэта, дарэчы, дазваляе СССР мець апераджаючыя ў параўнанні з сусветнымі тэмпы росту вытворчасці і спажывання мінеральнай сыравіны. Па вытворчасці многіх відаў сыравіны і паліва СССР выйшаў на першае месца ў свеце.

Але ў гэтага медаля ёсць і адваротны бок. Высокая забяспечанасць воляй-няволяй стымулявала неашчаднасць. Сёння ў СССР на адзінку нацыянальнага даходу затрачваецца больш сыравіны і энергіі ў параўнанні з лепшымі сусветнымі паказчыкамі. Напрыклад, СССР займае першае месца ў свеце па выплаўцы сталі, прыкметна абганяючы ЗША. Аб'ём жа прадукцыі машынабудавання і металаапрацоўкі, па ацэнках экспертаў, складае 75—80 працэнтаў амерыканскага, а маштабы будаўніча-мантажных работ амаль аднолькавыя.

Іменна таму савецкія эканамісты настойліва патрабуюць павысіць каэфіцыент выкарыстання сыравіны ў народнай гаспадарцы. Іх выступленні сёння ў савецкім друку часам нагадваюць рэестр страт. Гэта не значыць, вядома, што ў цэлым савецкая эканоміка менш эфектыўная, чым рыначная. Бо існуюць і іншыя параметры: абсалютны кошт сыравіны, сістэма гаспадарчых сувязей, рэнтабельнасць, магчымасць цэнтралізаваных інвестыцый, банкаўскія працэнты і г. д. Па большасці з іх планавая сістэма гаспадаркі мае несумненныя перавагі. І ёй, напрыклад, не пагражаюць спад або беспрацоўе.

Але чаму ж адмаўляцца і ад дадатковых магчымасцей, якія можна атрымаць, выкарыстоўваючы дасягненні навукова-тэхнічнага прагрэсу? Таму скрупулёзная анатомія страт разглядаецца ў СССР як даведнік па рэзервах. Так, падлічана, што ў савецкім машынабудаванні адходы ў стружку пры апрацоўцы чорных металаў у 1980 годзе склалі амаль 7 мільёнаў тон. І прыблізна такую ж (нават некалькі большую) лічбу ўяўляе сабой заданне на эканомію металу ў адзінаццатай пяцігодцы (1981—1985), якое стаіць перад чорнай металургіяй, за кошт далейшага павелічэння выпуску эфектыўных відаў металапрадукцыі, расшырэння яе асартыменту і павышэння якасці.

Да 12 працэнтаў агульнага аб'ёму выпуску складаюць страты цэменту ў будаўнікоў пры вытворчасці, транспарціроўцы і спажыванні гэтага віду сыравіны. Зразумела, пры сучасным узроўні тэхналогіі страты непазбежныя. Але ў адзінаццатай пяцігодцы савецкая будаўнічая індустрыя забяспечыць эканомію цэменту ў размеры 5—7 працэнтаў агульнага спажывання. А гэта важкая прыбаўка для эканомікі — бо кожны працэнт эканоміі матэрыяльных рэсурсаў у будаўніцтве складае сёння выйгрыш амаль 500 мільёнаў рублёў.

У цэлым у маштабах краіны адзін працэнт зніжэння матэрыяльных затрат забяспечваў у 1970 годзе павелічэнне нацыянальнага даходу ў 3 мільярды рублёў, а ў 1980 годзе — ужо шэсць мільярдаў рублёў.

Гэта і ёсць рашаючы фактар, які дыктуе неабходнасць узмацнення рэжыму эканоміі рэсурсаў у савецкай народнай гаспадарцы, нягледзячы на высокую ступень яго забяспечанасці. І гэта тлумачыць, чаму ў 80-х гадах інвестыцыі ў мерапрыемствы, якія ліквідуюць прычыны страт рэсурсаў, маюць у СССР безумоўны прыарытэт перад укладаннямі ў іх далейшае нарошчванне. Таму, скажам, савецкая энергетыка, якая мае самы нізкі ў свеце ўзровень расходу паліва на кілаватгадзіну электраэнергіі, працягвае зніжаць яго і ў адзінаццатай пяцігодцы.

Сумарная эканомія паліўна-энергетычных рэсурсаў у СССР за гэтае пяцігоддзе складзе больш за 200 мільёнаў тон умоўнага паліва, што раўназначна такому ж павелічэнню здабычы. Значэнне гэтага факта цяжка пераацаніць, калі мець на ўвазе, што здабываючая прамысловасць краіны, якая дае каля пяці працэнтаў кошту валавага нацыянальнага прадукту, у той жа час паглынае 40 працэнтаў усіх капіталаўкладанняў у прамысловасць.

І нарэшце, эканомія рэсурсаў забяспечвае зберажэнне нацыянальных запасаў прыродных рэсурсаў для будучых пакаленняў, што пры цяперашняй сітуацыі ў сусветнай эканоміцы не патрабуе каментарыяў.

Леанід КАРНЕЕЎ,
эканамічны аглядальнік АДН.

Багатымі ўраджаямі, высокімі надоямі славіцца ў Беларусі калгас «40 год Кастрычніка» Іванаўскага раёна. Эканамічна моцная гаспадарка мае магчымасць выдаткоўваць штогод каля аднаго мільёна рублёў на сацыяльна-культурнае будаўніцтва. Кожны год трыццаць сямей калгаснікаў атрымліваюць добраўпарадкаваныя кватэры ў індывідуальных дамах, якія будуюцца за кошт гаспадаркі. Трохпавярховая бальніца з амбулаторыяй, Дом культуры, спартыўная зала, адміністрацыйны будынак узведзены ў калгасе за апошні час.

НА ЗДЫМКАХ: на новай вуліцы калгаса; матэрыялы для сельскага этнаграфічнага музея рыхтуюць механізатар П. ПАЛТО і галоўны эканаміст П. ПТАШАЦ.

Фота Я. ПЯСЕЦКАГА.

ПІСЬМЫ ЗБЛІЗКУ

У ДЗЯДЗЬКІ ЛОГАША

У любую пару года прыгожы Свіцязянскі ландшафтны заказнік, на тэрыторыі якога размясціўся пансіянат «Свіцязь». Найбольш дапытлівыя адпачываючыя заўсёды знаходзяць для сябе тут шмат цікавага і пазнавальнага. Яны знаёмяцца з тымі мясцінамі ў наваколлі возера Свіцязь, дзе пісаў свае творы Адам Міцкевіч, бываюць у Навагрудскім музеі паэта, на хутары, дзе нарадзіўся вялікі сын польскага народа.

Вабіць і маляўнічае лясное возера з яго рэдкім раслінным светам, лес, шчодры на грыбы і ягады. А каму пашчасціць сустрэцца на лясных сцяжынках з Васілём Логашам, той даведаецца шмат цікавых гісторый з жыцця лясных насельнікаў. Узімку ён можа паказаць вам, дзе тупаюць дзікі, якія прыходзяць вечарам паласавацца жалудамі, для іх прынасенымі. А летам Васіль Міхайлавіч абавязкова пачастуе цудоўным бярозавікам, які ў момант праганяе смагу.

У нас была не адна сустрэча, і я даведаўся пра самае вялікае захапленне Логаша — пра яго любоў да кнігі. Паглядзеў я і унікальныя старадаўнія выданні, якія ёсць у багатай асабістай бібліятэцы Васіля Міхайлавіча. Асаблівую цікавасць выклікаюць адзін з першых энцыклапедычных слоўнікаў у саракa пяці тамах, выдадзены ў 1904 годзе ў Санкт-Пецярбургу пад рэдакцыяй Бракгаўза і Эфрона, і польская энцыклапедыя 30-х гадоў. Гераізму і самаадданасці рускага народа ў Айчыннай вайне 1812 года прысвечана юбілейнае выданне, прымеркаванае да стагоддзя перамогі над напалеонаўскай арміяй.

— Цяпер мая бібліятэка налічвае каля тысячы розных рэдкіх выданняў, якія прыцягваюць увагу многіх кнігалюбаў,— расказвае Логаш.—Улетку часу мала, каб пачытаць, а вось зімою адвожу душу. Раблю накіды. Некалькі разоў на Свіцязі адпачываў вядомы паэт Андрэй Вазнясенскі і быў у мяне частым госцем...

У бібліятэцы прыцягвае ўвагу першае пасмяротнае поўнае выданне збору твораў Лермантава, дзе змешчаны юначыя вершы і пераклады, аповесці і паэмы, экспромты і сцэнкі. Ёсць у Васіля Міхайлавіча і часопісы. Адзін з іх — «Сусветная ілюстрацыя», датаваны 1871 годам, часопіс «Ніва» за 1905 год расказвае пра рэвалюцыйныя хваляванні ў Расіі, змяшчае фотаздымкі.

— Я нярэдка звяртаюся да той літаратуры, якая расказвае пра нашу дзяржаву, вяртае мяне да вытокаў, — расказвае В. Логаш.— Ёсць цікавая кніга, выдадзеная ў 1889 годзе ў Вільні. Называецца «Гісторыя Літоўскай дзяржавы з старажытнейшых часоў». Гэта твор Бранцава. Першая праца па рускай мове аб гісторыі Літоўскай дзяржавы, яе ўзаемаадносінах з Польшчай і Расіяй.

Падшыўка тэарэтычнага часопіса «Бальшавік» за другое паўгоддзе 1939 года з асабістай бібліятэкі нямецкага міністра па справах Усходняй Еўропы Альфрэда Розенберга трапіла да Логаша з рэйхстага. Яе падарыў Васілю Міхайлавічу адзін з сяброў, дайшоўшых да Берліна. Гэта падшыўка мае вялікую цікавасць для гісторыкаў. У часопісах ёсць артыкулы, выступленні тэарэтычнага і палітычнага характару. У трынаццатым нумары, напрыклад, у раздзеле «Матэрыялы інстытута Маркса —Энгельса—Леніна пры ЦК ВКП(б)» змешчаны лісты Леніна Інесе Арманд. А ў пятнаццатым нумары часопіса за жнівень 1939 года — Закон аб ратыфікацыі дагавора аб ненападзенні паміж Савецкім Саюзам і Германіяй.

Доўга свецяцца вокны ў доме Васіля Логаша. Прыемна вечарам пагартаць кніжку, прасачыць за ходам часу, за думкай пісьменнікаў, розных палітычных дзеячаў, якія былі творцамі і сведкамі гісторыі.

Ідуць людзі ў госці да Логаша. Ідуць па справах, пазнаёміцца з кніжным скарбам унікальнай бібліятэкі.

С. ЛІТВІНЧУК.

АД МАСКВЫ—ДА ВОЛГІ

БЛІЗКІЯ ДАЛІ КРАІНЫ

У маі мне давялося пабываць на маляўнічых берагах Масквы-ракі ў Рузскім раёне. Тут знаходзіцца Дом адпачынку Усесаюзнага тэатральнага таварыства «Руза», пуцёўку ў які мне выдзеліў мясцовы камітэт прафсаюзаў. Амаль 500 чалавек з'ехаліся сюды з розных куткоў краіны. За нашым сталом — маленькі «інтэрнацыянал»: інжынер-канструктар з Баку, рабочы з Мінска, мастак з Масквы і я — журналіст з Мінска.

У час гутарак аб жыцці і падзеях у свеце мы хутка зблізіліся, пасябравалі. Часта атрымлівалася, што ў разнастайным меню выбіралі аднадушна адну страву, якая прыходзілася ўсім даспадобы. Асабліва чамусьці сыходзіліся на бульбе ў любым прыгатаванні!..

Многія бавілі час на рацэ. Шырокая, імклівая ў гэтых мясцінах, чыстая рака абяцала рыбаку ўдачу. Людзі з задавальненнем гулялі па лесе, хадзілі ў суседні санаторый «Дорахава», каб палюбавацца прыгожымі мясцінамі, паспытаць мінеральнай вады з крыніцы. Наш масквіч, вялікі аматар прыроды, блукаў па ваколіцах і шукаў карэнні, з якіх рабіў цікавыя скульптуры.

Зазначу, кожны знаходзіў сабе справу па душы. Да паслуг адпачываючых— база пракату спартыўнага інвентару, бібліятэка, більярдная, тэнісны корт, кіно, танцы, экскурсіі. Многія пабывалі ў Барадзіно, Звінігарадзе, у Пятрышчаве на месцы гібелі ў гады Вялікай Айчыннай вайны камсамолкі Зоі Касмадзям'янскай, пазнаёміліся з цудоўнымі мясцінамі сталіцы.

...Масква! У кожны прыезд заўважаеш у яе абліччы новыя рысы. З замілаваннем і гордасцю крочыш па знаёмых вуліцах. Параўноўваючы ўражанні мінулых гадоў з новымі, ловіш сябе на думцы: час нібы мастак-чарадзей уносіць у яе партрэт больш выразныя рысы.

У дні работы XIX з'езда ВЛКСМ яна здавалася асабліва маладой. Нават старажытныя вежы Крамля выглядалі паюнацку стройнымі, залачоныя купалы сабораў адлівалі святлом. Свяціліся ўсмешкі на тварах юнакоў і дзяўчат.

Сталіца закаханая ў моладзь. Яна жыве інтэрнацыянальнай сям'ёй. Мільёны яе сыноў, дачок, унукаў, праўнукаў выраслі, сагрэтыя яе клапатлівым сэрцам, вучыліся тут міру, справядлівасці, дабрыні.

На вуліцах і ў метро, на ВДНГ і ў музеях уражвае калейдаскоп з людскога натоўпу. Здаецца, што ты трапіў на міжнародны фестываль альбо на пасяджэнне ААН. Людзі з усіх рэспублік СССР, з розных кантынентаў ідуць побач і абменьваюцца добразычлівымі позіркамі, усмешкамі.

...Вуліца Максіма Горкага. Нядзеля. Сонечны, цёплы дзень. Вялікі тэрмометр на будынку паказвае 30 градусаў цяпла. Страката апранутыя маладыя людзі з чорнымі, бронзавымі і белымі тварамі разглядаюць помнік Юрыю Далгарукаму — заснавальніку Масквы, жвава размаўляюць, усміхаюцца. Нават не ведаючы мовы, можна зразумець, аб чым ідзе гаворка, бо чуеш вядомыя ўсяму свету словы: «Пушкін, Горкі, Маякоўскі...» Госці абмяркоўваюць, відаць, свой далейшы маршрут.

Расія. Савецкі Саюз. Дарагія нам паняцці. Сінонімы, якія дапаўняюць сэнс вялікага слова — Радзіма. Нядаўна мне пашчасціла ўбачыць яе прасторы, падарожнічаючы ад Мінска да Волгі поездам і самалётам.

...Усяго толькі гадзіну і дзесяць мінут імчыць ТУ-134 ад Масквы да Казані, сталіцы Савецкай Татарыі. І гэты кавалак «далі» ўмяшчае больш за 700 кіламетраў. Ёмісты ён і ў гістарычным сэнсе. Волга, Ленін — гэтыя словы таксама адсюль. У савецкі час аўтаномная рэспубліка вырасла, узмужнела і можа паспрачацца ў эканамічным развіцці з многімі заходнімі дзяржавамі. Вось яе сённяшні актыў — нафта, авіяцыйная і хімічная прамысловасць, аўтамабілебудаванне прадстаўляе вядомы КамАЗ і многае іншае.

Хутка сустрэча з Волгай. Для кожнага савецкага чалавека гэта паняцце інтэрнацыянальнае. На гэты раз убачу раку ў тым месцы, дзе яна зліваецца з Камай...

З новага аэрапорта аўтобус імчыць у стары, адкуль цяпер лятаюць самалёты па мясцовых лініях. І вось ветэран авіяцыі — працаўнік АН-2 — узяў курс на райцэнтр Аксубаева. Пад крылом захапляючы краявід: залатыя прамавугольнікі жытнёвых палёў, падсветленая сонцам зеляніна плантацый цукровых буракоў. Нібы жукі, то там, то тут па іх паўзуць трактары, бягуць аўтамашыны па дарогах. Ідзе жыццё пад ззяючым сонцам. На ўсёй дарозе ад Мінска да Волгі ў тую ліпеньскую нядзелю было горача і сонечна.

І вось фантастычным люстэркам зіхаціць Камскае вусце. З вышыні не ахапіць позіркам берагоў — сапраўднае мора! Павольна плывуць баржы, цеплаходы, здаецца, нерухома стаяць на вадзе плыты са сплаўнога лесу. Толькі ўбачанае з вышыні дазволіць уявіць неабсяжнасць даляў маёй краіны, яе прыгажосць.

Нарэшце зямля. Побач палі і людзі, якія сваёй працай так прыгожа аздабляюць яе. Цяпер можна разгледзець дэталі... Мясцовыя жыхары ў гутарках цікавіліся жыццём на Беларусі. Ветэран прасіў расказаць аб Мінску, у якім давялося быць у час вайны. Размовы аб многім, аб жыцці. Пыталі, які ў нас чакаецца ўраджай. І нібы магічны рэфрэн, сярод слоў і думак гучала: «Толькі б не было вайны, няўжо гэта магчыма — вайна!..»

У свеце трывожна. Але жыццё ідзе, і людзі спадзяюцца на мір. Аб міры для ўсіх людзей на Зямлі дбае і Расія —Савецкі Саюз, мая Радзіма.

Георгій ПАВУЛЯ.

За першае паўгоддзе Мінская скургалантарэйная фабрыка імя Куйбышава выпусціла звышпланавай прадукцыі на 600 тысяч рублёў. Але, як справядліва лічаць тут, не ў гэтым галоўнае. Галоўнае — попыт пакупнікоў, іх ацэнка вырабаў. Што ж, прадпрыемства можа ганарыцца сваёй працай. І ў нас у Беларусі, і ў іншых саюзных рэспубліках, за мяжой прадукцыя фабрыкі заслужыла высокую ацэнку. Аб гэтым сведчаць шматлікія водгукі, дыпломы, атрыманыя на айчынных і міжнародных кірмашах.

Прадпрыемства ідзе ў нагу з модай і часам. Штогод жаночыя сумачкі, дарожныя чамаданы, партманеты, рамяні і іншая прадукцыя абнаўляюцца на 50 — 60 працэнтаў. Вось і нядаўна, напярэдадні вучэбнага года, школьнікі атрымалі прыгожыя і вельмі зручныя партфелі новай мадэлі.

НА ЗДЫМКУ: новыя мадэлі школьных партфеляў дэманструе загадчыца асартыментнага кабінета В. ЛАГАЦКАЯ.

Фота П. ЯЎГЕНАВА.

«СПАДЧЫНА» НА ЗЯМЛІ ПРОДКАЎ

На працягу месяца ў нашай краіне знаходзілася турыстычная група канадцаў славянскага паходжання, якая складалася з членаў Рабочай асацыяцыі ўзаемадапамогі, Таварыства аб'яднаных украінскіх канадцаў і Федэрацыі рускіх канадцаў. Турысты пабывалі ў Маскве, Ленінградзе і Кіеве, зрабілі падарожжа на параходзе па Дняпры, наведалі многія гарады Украіны. 29 чэрвеня група прыбыла ў канечны пункт падарожжа — сталіцу Беларусі Мінск.

Ніколі яшчэ наш горад не сустракаў такой вялікай групы землякоў з Канады. 176 чалавек аб'ядналіся разам, каб здзейсніць гэта падарожжа на Радзіму сваіх бацькоў і дзядоў. Для многіх паездка была першым наведаннем нашай краіны. Аб гісторыі стварэння групы мы папрасілі расказаць аднаго з яе кіраўнікоў, галоўнага дырэктара Рабочай асацыяцыі ўзаемадапамогі Яўгена Нікалішына.

— Мы вельмі даўно рыхтаваліся да гэтай паездкі, — сказаў ён. — Прагрэсіўныя канадцы славянскага паходжання заўсёды праяўлялі шчырую цікавасць да жыцця Савецкай краіны, асабліва тыя, хто нарадзіўся ўжо ў Канадзе. Для іх ваша краіна — зямля продкаў. Не выпадкова наша група называецца «Спадчына». З дапамогай таварыства «Родина», «Украіна» і «Радзіма» нам удалося арганізаваць гэтую спецыялізаваную, я б сказаў, грандыёзную па маштабу групу. Мы вырашылі здзейсніць нашу паездку іменна сёлета і прысвяціць яе тром знамянальным датам у гісторыі славянскіх народаў — 60-годдзю ўтварэння СССР, 1500-годдзю Кіева і 100-годдзю з дня нараджэння вялікіх беларускіх паэтаў Янкі Купалы і Якуба Коласа.

На прыёме, арганізаваным Беларускім таварыствам «Радзіма», намеснік старшыні прэзідыума Мікалай Слінко расказаў гасцям аб дзейнасці таварыства па расшырэнню культурных сувязей замежных суайчыннікаў з маці-Радзімай. Прадстаўнік МЗС БССР Алег Ціханаў расказаў аб дасягненнях рэспублікі за гады Савецкай улады, аб яе ўдзеле ў міжнародных арганізацыях.

Ад імя групы выступіў нацыянальны сакратар Таварыства аб'яднаных украінскіх канадцаў Васіль Гарасім.

— Мы ад усёй душы дзякуем усім, хто аказаў нам дапамогу ў арганізацыі гэтай паездкі, хто зрабіў наша знаходжанне на роднай зямлі такім цудоўным, — сказаў ён. — У нашай групе сабраліся людзі з розных канцоў Канады, прадстаўнікі чатырох пакаленняў канадцаў украінскага, рускага і беларускага паходжання. Гэта бабулі і дзядулі, сыны, дочкі і ўнукі. Многія прыехалі цэлымі сем'ямі, каб выказаць сваю нязгасную любоў да гэтай зямлі. Для тых, хто тут упершыню, гэта паездка была ў многім павучальнай. Яны не толькі пазнаёміліся з Радзімай продкаў, але, самае галоўнае, змаглі асабіста адчуць страснае жаданне савецкіх людзей жыць у міры і дружбе з усімі народамі зямлі. Мы аддаём даніну глыбокай павагі памяці 20 мільёнаў савецкіх людзей, што загінулі і за тое, каб мы ў Канадзе, нашы дзеці і дзеці нашых дзяцей змаглі жыць у міры. З пачуццём глыбокай адказнасці мы абяцаем тут, што зробім усё, што ў нашых сілах, каб трагедыя вайны ніколі больш не паўтарылася. Мы лічым, што наш тур з'яўляецца турам дружбы. Ён паслужыць справе ўмацавання ўзаемаразумення паміж народамі Канады і Савецкага Саюза. Я ўпэўнены, што большасць з нас цяпер заўсёды будуць імкнуцца яшчэ раз наведаць вашу цудоўную краіну. «Спадчына» — першая група землякоў такога маштабу, але, як відаць з нашага вопыту, далёка не апошняя.

Рыгор ФАМЕНКА.



Святам дружбы называюць у нас сустрэчы прадстаўнікоў трох братніх народаў на граніцы РСФСР, Украіны і Беларусі. Сёлетняя сустрэча прысвечана 60-годдзю ўтварэння СССР. На мітынгу ля манумента Дружбы — ветэраны вайны і працы, калгаснікі і рабочыя, моладзь. Памятным гэты дзень быў і для юнакоў і дзяўчат Гомельскай, Чарнігаўскай, Бранскай абласцей, якія тут атрымалі пашпарты грамадзян СССР. Сустрэча завяршылася канцэртам калектываў мастацкай самадзейнасці.

НА ЗДЫМКАХ: канцэрт у парку Дружбы; на свяце сустрэліся ганаровы грамадзянін Гомеля слесар-зборшчык завода вымяральных прыбораў Герой Сацыялістычнай Працы П. ДЗЕМЧАНКА, ганаровы грамадзянін Чарнігава ткачыха камвольнага камбіната Герой Сацыялістычнай Працы К. КАМІЛКА і ветэран Вялікай Айчыннай вайны з Чарнігава Герой Савецкага Саюза Ю. САГАЙДАЧНЫ.

Фота І. ЮДАША.

НОВЫЕ ТРУБЫ ДЛЯ СВЕРХМОЩНЫХ ГАЗОПРОВОДОВ

ДЕШЕВИЗНА И НАДЕЖНОСТЬ

Одним из ключевых моментов советской газовой программы 80-х годов станет, как считают специалисты, массовое производство многослойных труб и оборудования для газопроводов высокого давления.

Сегодня и в СССР, и в других странах мира газ по магистральным трубопроводам перекачивают под давлением 75 атмосфер. Многослойные трубы, созданные советскими учеными, позволяют поднять давление до 100—120 атмосфер и таким образом значительно увеличить пропускную способность газопровода. По расчетам академика Бориса Патона, директора Института электросварки Академии наук Украины, где разработана конструкция новых труб, производительность газопровода большого диаметра (1 420 миллиметров) может быть увеличена в 1,5—2 раза.

Новая конструкция принципиально отличается от традиционной. Трубу делают не из толстого монолитного листа, а из довольно тонкой рулонной стали, которую наматывают на барабан, наружный диаметр которого равен внутреннему диаметру будущей трубы. Число витков зависит от требуемой прочности. Например, для трубы в 1420 миллиметров, рассчитанной на давление 100 атмосфер, надо 4—6 слоев, на 120 атмосфер — 5—7 слоев и так далее.

Немаловажно, что новые трубы делают не из дорогой и дефицитной ниобиевой стали, а из низколегированной. Себестоимость многослойной трубы примерно на 20 процентов ниже, чем трубы со сплошной стенкой. При этом, как показали испытания, новая конструкция оказалась надежнее, чем труба-монолит. Разделив толщу металла на слои, отмечает академик Патон, мы тем самым увеличили его прочность и пластичность: если вдруг в трубопроводе образуется трещина, она как бы вязнет в этих слоях, не распространяясь на значительное расстояние.

Первые многослойные трубы были изготовлены на опытном участке Харцызского трубного завода (юг Украины). А несколько месяцев назад начала действовать первая очередь крупного цеха по производству многослойных труб в городе Выкса (Центральная Россия), рассчитанная на выпуск 250 тысяч тонн труб в год. Полная же мощность этого цеха — 1 миллион тонн первоклассных многослойных труб большого диаметра в год.

Вадим СМЕТАНИЧ.

РУТМАН НА «СВАБОДЗЕ»,

або колькі каштуюць сёння салёныя гурочкі

Не раз шэфы радыё «Свабода» (РС) перад усім светам білі сябе ў грудзі, спрабуючы запэўніць уяўную аўдыторыю слухачоў у высакародстве выбраных мэт. Не раз паўтаралі, што гэта самая «Свабода» служыць «умацаванню ўзаемаразумення паміж народамі». Ні больш, ні менш! Такія заявы, вядома ж, чысцейшай вады мана. На самай жа справе, усё выглядае інакш. Куды менш добрасумленна і куды больш непрыстойна. У адным з сакрэтных дакументаў, падпісаных самім прэзідэнтам камітэта РС, гаворыцца: «Мы павінны дапамагчы слухачам дзейнічаць больш эфектыўна, каб змяніць існуючую савецкую сістэму... Нашы перадачы павінны прымусіць людзей сумнявацца ў савецкай сістэме, у дзеяннях Савецкага ўрада...» Каментарыі да гэтага дакумента, як гаворыцца, лішнія. Як лішнія пасля гэтага і запэўніванні «Свабоды» ў сваёй бязгрэшнасці.

Размяшчаючы радыёстанцыю «Свабода» ў Мюнхене, яе гаспадары адначасова стварылі аналагічнае падраздзяленне ў Нью-Йорку. А раптам прыйдзе час, калі з Еўропы трэба будзе выбірацца! Цяпер там старанна працуюць сотні людзей. У падборы кадраў разведвальныя службы не вельмі патрабавальныя. Даўно ж вядома, што брудныя справы робяцца рукамі людзей нядобрасумленных. Але ў Нью-Йорку, як і ў Мюнхене, сабраліся ўсе самыя гнюсныя падонкі, якім нават паважаючыя сябе буржуазныя журналісты не пададуць рукі і не сядуць з імі за адзін стол паза сценамі радыёстанцыі. Тут знайшлі прымяненне сваім «здольнасцям» і ваенныя злачынцы — здраднікі, паліцаі, рабалепныя халуі, перапоўненыя дзікай злосцю да ўсяго савецкага, нікчэмныя людзі з падазроным мінулым.

Аб адным з такіх неацэнных набыткаў нью-йоркскага падраздзялення радыё «Свабода» апошніх гадоў і пойдзе размова. Звычайна ён прадстаўляе сябе Аркадзем Насовічам. Але гэты супрацоўнік «Свабоды» з роўным поспехам мог бы адрэкамендавацца і баронам Мюнхгаўзенам, і каралём Бакасам Першым. Як і большасць яго калег па мюнхенскай кухні, выходзіць у эфір пад уласным прозвішчам ён не рызыкуе. Відаць, не без падставы. Яму, як і ўсім, хто пасецца на «Свабодзе», ёсць што ўтойваць. Заікніся толькі Насовіч, што Рутман — гэта ён сам і ёсць, як тут жа сапсуеш усю абедню. Хто ж паверыць гэтаму «барацьбіту за свабоду»?

Яшчэ не астыў след Рутмана ў Мінску. У 1974 годзе, паддаўшыся на сіяніскцкія абяцанні, ён выехаў у Ізраіль для «ўз'яднання» са сваякамі. Да «свяшчэннай зямлі продкаў» так і не дабраўся, а аказаўся зусім у другім месцы — Злучаных Штатах. Слёзныя просьбы аб уз'яднанні са сваякамі ў Ізраілі аказаліся самай звычайнай маной, як і фальшывы развод з жонкай Раісай Цыгановіч, афармлены ім незадоўга да ад'езду. Зроблена гэта было на той «пажарны» выпадак, калі давядзецца прасіцца назад. Апаска Рутмана была цалкам рэальнай...

Неяк, распінаючыся перад мікрафонам РС аб амерыканскім іміграцыйным заканадаўстве, ён расхвальваў клопаты ўлад ЗША пра бедных імігрантаў. Там, маўляў, робіцца ўсё, каб стварыць ім «найбольш спрыяльныя ўмовы існавання». Рутман, вядома, перабраў: гэта ўсяго толькі чарговая мана. Шматлікія факты гавораць пра другое. Іммігранты — гэта найбольш абяздоленая частка насельніцтва ЗША, яны знаходзяцца ў бяспраўным становішчы, пастаянна падвяргаюцца дыскрымінацыі і адчуваюць сябе людзьмі другога сорту. Ні слова Рутман, вядома, не сказаў пра сябе і пра тое, як яму ў ЗША стварылі самыя «спрыяльныя» ўмовы для існавання і як беспаспяхова спрабаваў зрабіць там «кар'еру». Пасля доўгіх пакутлівых хаджэнняў яму, чалавеку з вышэйшай адукацыяй, даверылі ў адным кафэ мыць посуд. Так і мыў бы брудныя талеркі, не падбяры бедалагу хлопчыкі з ЦРУ, гэта значыць радыёстанцыі «Свабода». Паглядзелі, пакруцілі — знаходка не надта якая, але прыдасца.

Цяпер Рутман лічыцца «спецыялістам» па савецкаму заканадаўству, нават вядзе рубрыку «Ты і закон». Колькі хлусні, злосці, нянавісці да ўсяго савецкага ў яго выступленнях! Стараецца: трэба ж адпрацоўваць тыя трыццаць іудзіных срэбранікаў, якія яму выплачваюць гаспадары. І самае

ВКЛАД РСФСР В РАЗВИТИЕ НАЦИОНАЛЬНЫХ ОКРАИН

ДЕЛА БОЛЬШИЕ И МАЛЫЕ — СООБЩА

Советское государство унаследовало от царской России не только отсталую и разоренную экономику, но и крайне неравномерное географическое размещение производства. Свыше трети всей промышленности было сконцентрировано в сравнительно небольшом центральном районе (Московская и прилегающие к ней губернии), около 10 процентов — в Петербурге, примерно 20 процентов — на Украине. Огромные же пространства к востоку от Урала и Средняя Азия являлись, по существу, колониальными владениями.

Кроме того, важнейшие отрасли, в особенности черная металлургия, угольная, нефтяная промышленность, сосредоточивались в отдельных «кустах», разделенных большими расстояниями. Скажем, девять десятых всего угля добывалось в Донецком бассейне, а 95 процентов нефти — в районах Баку и Северного Кавказа.

Такое размещение жизненно важных отраслей было невыгодно и в экономическом, и в социальном отношениях. Однако господствовавшие в добывающей промышленности иностранные компании стремились к получению максимальной прибыли и не собирались вкладывать деньги в освоение новых районов. Например, компания Нобеля, владевшая многими нефтепромыслами в районе Баку, всячески препятствовала поискам нефти в других районах и даже пыталась доказать, будто Россия бедна полезными ископаемыми.

Легкая промышленность размещалась тоже неравномерно и в отрыве от сырьевой базы: весь хлопок выращивался в Средней Азии, а обрабатывался в европейской части страны.

Сельское хозяйство в окраинных губерниях велось самыми примитивными способами. В среднеазиатском регионе, например, значительная часть населения занималась архаичным кочевым скотоводством, а в земледелии основным орудием служил кетмень.

В первые же дни своего существования Советская власть в «Декларации прав народов России» провозгласила равенство всех народов и этнографических групп бывшей царской империи, отменила все национальные привилегии и ограничения. Но кроме юридического нужно было обеспечить еще и экономическое, социально-культурное равенство.

Основной вклад в решение этой труднейшей задачи внесла Россия, обладавшая наибольшим экономическим потенциалом. Уже во время гражданской войны Советское правительство приняло декрет (от 17 мая 1918 года) «Об организации оросительных работ в Туркестане». На эти цели было отпущено 50 миллионов рублей, выделены техника и материалы.

В это же время в некоторых районах Дагестана (Северный Кавказ) от чумы погиб весь скот. Советское государство, несмотря на свои весьма скудные в то время валютные резервы, ассигновало миллион серебряных рублей для закупки скота в соседних зарубежных странах. Восемьсот тысяч золотых рублей было израсходовано на закупку техники для расширения оросительных систем в Муганской степи (Закавказье).

Еще больший размах приобрела помощь России отсталым окраинам после окончания гражданской войны и изгнания из страны иностранных интервентов. Рабочие и инженеры, агрономы, врачи и учителя ехали на Чукотку и в Казахстан, Якутию и Узбекистан, Бурятию и Закавказье, чтобы строить заводы и города, прокладывать дороги, возводить плотины.

В первые годы Советской власти возможности нового строительства были невелики. Поэтому, чтобы ускорить индустриализацию окраин, из центра в эти районы переводились целые предприятия. Так, в 1923—1924 годах в Грузию, Казахстан и Азербайджан было перебазировано оборудование нескольких московских текстильных фабрик. В Туркмении и Узбекистане появились предприятия, по существу, перебазированные из Московской и Рязанской губерний.

По мере восстановления и укрепления народного хозяйства страны в окраинных районах все шире разворачивалось новое строительство. Причем с самого начала их экономика развивалась комплексно. В этом принципиальное отличие социалистической индустриализации от той, которую ныне навязывает Запад ряду развивающихся стран, оставляя за ними роль сырьевых придатков.

В государственных пятилетних планах учитывались природные условия, географическое положение, транспортные связи, навыки и традиции населения каждой республики и региона, с тем чтобы как можно лучше использовать их экономические возможности. В республиках, располагавших большими запасами полезных ископаемых (Казахстане, Азербайджане, Туркмении, Башкирии и др.), создавались цепочки производств для их добычи и переработки. Там, где имелись крупные лесные ресурсы (Чувашия, Татария и др.), развивалась целлюлозно-бумажная и деревообрабатывающая индустрия. В крупных земледельческих районах возводились предприятия по переработке сельскохозяйственного сырья. На основе использования богатейших угольных и рудных месторождений Урала и Западной Сибири был создан мощный металлургический узел, включающий Магнитогорский и Кузнецкий комбинаты, Ново-Тагильский металлургический завод.

В этих же районах создавалось машиностроение, обслуживающее «профильные» отрасли, а также приборостроение, производство строительных материалов.

Ускоренную индустриализацию отсталых окраин можно характеризовать хотя бы такими цифрами: с 1922 года (когда народы добровольно объединились в Союз Советских Социалистических Республик) промышленное производство в Российской Федерации возросло в 478 раз, тогда как в Армении в 1 008, Казахстане — в 902, Таджикистане — в 874, Киргизии — в 690 раз. Столь же высокими были темпы развития Якутии, Бурятии, Калмыкии и других автономных республик, вошедших в Российскую Федерацию.

Уже в тридцатых годах во всех союзных республиках были образованы национальные научные центры, действовали десятки высших учебных заведений, широкая сеть лечебных учреждений, практически повсеместно была ликвидирована безграмотность.

Ныне уровень социально-экономического развития всех 15 союзных республик выравнялся. Об этом свидетельствует хотя бы тот факт, что основные показатели в них — национальный доход на душу населения, техническая оснащенность труда, его производительность — стали примерно одинаковыми.

В СССР создан единый народнохозяйственный комплекс, в котором экономики республик являются его органичными частями, дополняют друг друга, опираясь на единые системы — энергетическую, транспортную, нефте- и газоснабжения, связи и др.

Пятилетние и годовые планы союзных республик и отраслевых министерств согласовываются и строятся так, чтобы теснее координировать работу смежных производств, не допуская нерациональных перевозок, лучше использовать выгоды специализации производства и разделения труда.

Каждая союзная республика располагает теперь мощным многоотраслевым потенциалом. Так, Киргизия, которая была одной из самых отсталых и нищих окраин царской России, ныне производит сельскохозяйственные машины, детали для автомобилей, электрические приборы, десятки других видов продукции. Все это идет как на внутренние нужды республики и страны в целом, так и на экспорт.

Союзные республики совместными усилиями выполняют крупные экономические программы по освоению новых территорий, создают мощные территориально-производственные комплексы (ТПК), строят новые металлургические комбинаты, гидроузлы. В возведении, скажем, каскада гидроэлектростанций на реке Нарын (в Киргизии) участвуют рабочие и инженеры многих республик, десятков национальностей. Машины и оборудование сюда идут из Ленинграда, Харькова, Новосибирска, Запорожья и многих других городов страны. Словом, все дела, как большие, так и малые, в многонациональной Стране Советов осуществляются сообща и с выгодой как для государства в целом, так и для каждой республики в отдельности.

Леонид ПЕКАРСКИЙ.

ТВОРЫ НАРОДНЫХ МАЙСТРОЎ У ГАНЕ

У Акры з вялікім поспехам прайшла выстаўка мастацкіх вырабаў беларускіх народных промыслаў, прысвечаная 60-годдзю ўтварэння СССР.

«Мы вельмі рады, што нам удалося атрымаць уяўленне аб самабытнай творчасці беларускіх майстроў прыкладнога мастацтва,— заявіў, адкрываючы выстаўку, прадстаўнік Часовага савета нацыянальнай абароны Ганы Х. Х. Адрэй. — Экспанаты гэтай выстаўкі пераканаўча сведчаць, што Беларуская ССР, яе працавіты, таленавіты народ дасягнулі сапраўды выдатных поспехаў за гады Савецкай улады».

Экспазіцыя была разгорнута ў Савецкім культурным цэнтры, а затым у Ганскім цэнтры мастацтваў. З ёй пазнаёміліся прадстаўнікі ганскай грамадскасці, інтэлігенцыя, майстры прыкладнога мастацтва. «Гэта выстаўка робіць моцнае ўражанне, — сказаў прэзідэнт Нацыянальнай асацыяцыі мастакоў Ганы А. О. Барціміёўз. — Усе аматары народнай творчасці нашай краіны, якім удалося яе наведаць, назаўсёды запомняць талент і самабытнасць нашых беларускіх калег. Іх работы ярка дэманструюць, чаго могуць дабіцца мастакі і народныя ўмельцы пры Савецкай уладзе, якая праяўляе пастаянны клопат не толькі аб эканамічным, але і сацыяльна-культурным развіцці грамадства».

У час Тыдня Беларускай ССР у Гане дэманстраваліся савецкія фільмы, у тым ліку «Савецкая Беларусь» і «Мінск». «Нам вельмі падабаліся гэтыя фільмы,— сказаў прэзідэнт Ганскай нацыянальнай асацыяцыі майстроў прыкладнога мастацтва С. Асеі. — Мы будзем рады і надалей прымаць у Гане выстаўкі, падобныя на тую, якую мы тут бачылі, і з задавальненнем глядзець савецкія фільмы».

Ю. САВІЦКІ.

характэрнае ва ўсім гэтым тое, што аб савецкім законе распінаецца той, хто сам ніколі яго не прытрымліваўся: самы звычайны злодзей, жулік, п'яніца і маральна распусны чалавек.

У Савецкай краіне яму была прадастаўлена магчымасць атрымаць вышэйшую адукацыю (бясплатна, вядома!) — Рутман скончыў Мінскі юрыдычны інстытут. Некаторы час ён дзейнічаў на юрыдычнай ніве. Хутка, аднак, з трэскам быў звольнены за грубыя парушэнні савецкіх законаў, злоўжыванні па службе і непрабуднае п'янства ў рабочы час.

Затым, змяніўшы некалькі месц работы, нарэшце, «знайшоў» сябе ў галіне гандлю. З цягам часу стаў нават загадчыкам аднаго з магазінаў па гандлю гароднінай. І тут адбылося тое, што немінуча павінна было адбыцца. Загадчыка-жуліка злавілі на месцы злачынства.

Перад намі крымінальная справа № 7509, заведзеная 4 лістапада 1971 года. Расследаваннем было ўстаноўлена, што загадчык магазіна № 40 Рутман увайшоў у злачынную змову з шафёрам-экспедытарам Мінскага аўтакамбіната, з якім сумесна ўкралі 19 бочак салёных гуркоў, усяго больш тысячы кілаграмаў на суму 348 рублёў. Каб пазбегнуць адказнасці, на следстве хітрыў, адмаўляўся.

Але як ні выкручваўся Рутман — не памагло. Абвінавачаны неабвержнымі доказамі, нарэшце, вымушаны быў прызнаць сваю віну поўнасцю. Салёныя гурочкі абышліся Рутману двума гадамі пазбаўлення волі.

Вось які Аркадзь Насовіч «спецыяліст» па савецкіх законах на «Свабодзе». Але, відаць, ён цалкам задавальняе гаспадароў, таму што ў Мюнхене і Нью-Йорку любяць тухляціну ды яшчэ з салёнымі гурочкамі.

«Творчасць» Рутмана-Насовіча — гэта перш за ўсё беспардонны паклёп на сваю былую радзіму, своеасаблівыя фальсіфікацыі, спекуляцыі, накіраваныя на тое, каб у скажоным святле прадставіць нашу рэчаіснасць, грамадства, законы. У гэтай бруднай справе былы юрыст-гандляр дабіўся вялікага поспеху. Асабліва ўдаюцца яму ўзоры чалавечага глупства. Безумоўна, ён і сам не верыць той бязглуздзіцы, якую вярзе. Не выпадкова былы амерыканскі сенатар У. Фулбрайт слушна заўважыў, што тое, пра што гаворыць «Свабода», «ніжэй за ўсялякую крытыку».

Адзін з опусаў Рутмана быў, напрыклад, прысвечан дасканаласці амерыканскага заканадаўства. Захлёбваючыся ад захаплення, ён разважае аб тым, як вольна жывецца амерыканскаму беспрацоўнаму. Маўляў, з першага дня звальнення «амерыканскі рабочы адчувае на сабе дапамогу дзяржавы». А вось, маўляў, у Савецкім Саюзе аб беспрацоўных не думаюць і нават няма закона, які «прадугледжваў бы дапамогу на выпадак страты работы». І далей, рэзюмуе ён, «калі параўнаць становішча амерыканскага і савецкага беспрацоўнага, то будзе яно не на карысць апошняга».

Які пасаж! Куды ўжо нам да «дасканаласці» амерыканскіх законаў. Сапраўды, няма ў нас законаў па пытаннях беспрацоўя, і па адной простай прычыне. Даўно вядома, што ў нашай краіне няма беспрацоўя і кожны грамадзянін можа выбраць сабе працу, прафесію, род заняткаў у адпаведнасці са сваім прызваннем, прафесійнай падрыхтоўкай, здольнасцямі. Гэта права не толькі замацавана ў Канстытуцыі СССР, але і забяспечваецца дзяржавай. Таму і няма неабходнасці прымаць якія-небудзь законы аб беспрацоўных, а тым больш іх «удасканальваць».

Як і іншыя сродкі масавай інфармацыі Захаду, РС ужо доўгі час ўзводзіць горы хлусні аб «праследаваннях» у Савецкім Саюзе людзей за «іншадумства». Гэтай неіснуючай праблеме «Свабода» прысвячае значную частку сваіх перадач. У тогу «абаронцы» правоў чалавека ўбірае сябе і Рутман.

Здраднік заўсёды і ўсюды застаецца здраднікам. Рутман здрадзіў не толькі краіне, у якой ён нарадзіўся. Ён здрадзіў перш за ўсё сабе, сваім сябрам, родным, знаёмым.

Ці можна хоць неяк апраўдаць чалавека, які, адмовіўшыся ад свайго сумлення, здрадзіў нават свайму брату? У час Вялікай Айчыннай вайны загінуў брат Рутмана. Цяпер Рутман у адной цеснай кампаніі з паліцаямі, граміламі з зондэркаманд, з тымі, хто ў час вайны вешаў, забіваў савецкіх людзей. І не выключана, што кроў яго брата на руках аднаго з тых, хто цяпер поплеч «працуе» з Рутманам.

Да якой нізасці трэба было дайсці Рутману, каб звязаць сябе, напрыклад, са здраднікам Нігматуліным, былым супрацоўнікам татара-башкірскай рэдакцыі «Свабода». Гэта ён, убачыўшы групу навічкоў, прыбыўшых транзітам з Ізраіля на РС, закрычаў у дзікай злосці: «Як яны смеюць гаварыць на сваёй мове пры мне, эсэсаўскім афіцэры!» Цяпер яго месца заняў такі ж здраднік Горыер Султанаў, які служыў у СС разам з Нігматуліным, прадаўшым гестапа пісьменніка Мусу Джаліля.

Ці можна пасля гэтага гаварыць аб самай звычайнай чалавечай годнасці і элементарнай павазе да сябе?!

Адзін з высокапастаўленых супрацоўнікаў РС неяк заявіў: «У нас працуюць людзі толькі з бездакорнай рэпутацыяй». Што ж, усякі мерае на свой аршын. З пункту гледжання шэфаў РС, такія, як Рутман, заслугоўваюць іх прыхільных адносін. Для іх, чым больш падазронае мінулае чалавека, чым больш на ім усякага бруду, тым ён жаданейшы на «Свабодзе», тым даражэй цэніцца. Што ж, як кажуць у нас, які поп, такі і прыход.

Яўген ШЭЎЧЫК.

Вы хацелі сустрэцца

ТАКІМ ЯГО ВЕДАЮЦЬ, ТАКІМ ЯГО ЛЮБЯЦЬ

Імя Здзіслава Стомы — сярод зорак першай велічыні ў купалаўскім тэатры. Ён адзін з тых, хто праславіў свой тэатр, упісаўшы ў яго гісторыю некалькі радкоў «сваім адметным почыркам». Акцёрам рэдкага камедыйнага дараванння, надзвычай шырокага творчага дыяпазону лічаць народнага артыста СССР З. Стому мастацтвазнаўцы.

Сёлета ў жніўні выдатнаму майстру беларускай сцэны спаўняецца 75 гадоў. Наш карэспандэнт сустрэўся са Здзіславам СТОМАЙ.



—Здзіслаў Францавіч, не так доўго я гутарыла са старымі мінчанамі, каму ў свой час давялося бачыць вас у ролі пана Быкоўскага ў купалаўскай «Паўлінцы». Было гэта, здаецца, адразу пасля Айчыннай вайны... А яны ўсё памятаюць. Удзячны вам. Кажуць, што былі проста зачараваныя ігрой, прыгадваюць, як доўга не адпускалі вас са сцэны. Успомніце і вы той час.

— Не думайце, даражэнькая, што мне толькі ўспаміны і засталіся. Спраў і цяпер хапае. З нецярплівасцю чакаю адкрыцця сезона. Як заўсёды, мяркую выйсці на сцэну. Пра Быкоўскага раскажу з задавальненнем. Наш тэатр знаходзіўся ў эвакуацыі ў Томску, калі мяне і Барыса Платонава зацвердзілі на ролю Быкоўскага. Спакваля «ўжываўся», як кажуць, у вобраз. Прыгадваў падобных тыпаў з уласнага жыцця. На рэпетыцыі, што цікава, у мяне ўсё ішло як быццам нядрэнна... І толькі калі адчынялася заслона і я бачыў перад сабой людзей, мой Быкоўскі «ажываў», яго характар набываў фарбы, адценні. Я і сам гэта адчуваў. Наогул, у час спектакля я заўсёды знаходзіўся ў своеасаблівым стане, параўнаць які можна, мабыць, з тым, калі ў паэта пішуцца вершы...

— Дарэчы, пра вершы. Менавіта з вершаў, здаецца, і пачалася ваша артыстычная кар'ера?

— Яны ўзнікалі ў галаве лёгка. Нездарма ж мяне, 17-гадовага хлопца, пацягнула на сцэну, у рабочы клуб, дзе складаў і сам выконваў куплеты на злабадзённыя тэмы, выкрываючы ў іх гультаёў, парушальнікаў дысцыпліны. Некаторы час працаваў у тэатры юнага гледача імя Крупскай пад кіраўніцтвам Еўсцігнея Міровіча, а потым мяне запрасілі ў трупу БДТ-1.

Аднойчы мне давялося пісаць куплеты ў макаёнкаўскай п'есе «Каб людзі не журыліся» для свайго «героя». Частушкай, што я напісаў і выконваў, заканчваўся спектакль.

Скажу па сакрэту, што гэтыя свае заняткі я так і не кінуў зусім. Кніжка, якую я прысвяціў дзецям, хутка выйдзе ў выдавецтве «Юнацтва».

Слухаць Здзіслава Францавіча — адно задавальненне. Гаворыць ён распеўна, з мяккай іроніяй, кожнае слова мне хочацца параўнаць з нечым круглым. І вочы пры гэтым зменлівыя, усмешлівыя, вельмі жывыя, па-маладому ясныя, мудрыя, вочы шмат чаго пабачыўшага ў жыцці чалавека.

Ён жыве ў прасторнай кватэры вышыннага дома, што ўзняўся непадалёку ад Свіслачы. Дзеці ўжо дарослыя, маюць свае сем'і, раз'ехаліся. Але ж усё ідзе сваім парадкам —трэба дапамагчы гадаваць унукаў. Маленькая Алачка часта хварэе, вось дзед і вырашыў узяць яе да сябе. Летам яны з жонкай і з малой звычайна жывуць на дачы ў Гарадзішчы. Дачу, дарэчы, ён пабудаваў уласнымі рукамі, бо мае такісякі вопыт: у юнацтве працаваў бетоншчыкам, арматуршчыкам, мулярам...

— Прабачце мяне за цікаўнасць, Здзіслаў Францавіч, а вось гэты партрэт на кніжнай шафе, хто на ім?

— Мой бацька. Малады яшчэ, праўда? Ён быў цікавы чалавек, таленавіты. Душа яго прагла музыкі, мастацтва. Але трэба было зарабляць грошы—сям'я вялікая. Памятаю, як мы з ім хадзілі ў касцёл, каб паслухаць арган. Потым купіў мне канцэрціну, каб я мог цешыць музыкай сваіх братоў і сясцёр. І я іграў на гэтай бацькоўскай канцэрціне ў клубах, а потым у тэатры. Мае музычныя здольнасці вельмі дарэчы былі ў той момант, калі я з тэатрам апынуўся ў эвакуацыі ў Томску. У горадзе знаходзіўся вялікі ваенны шпіталь. Мы з сябрам выступалі перад байцамі, я іграў на канцэрціне.

— Ніколі не чула, як гучыць гэты інструмент...

— Дык я зараз сыграю. Вось толькі пальцы ўжо не вельмі спрытныя.

І гаспадар дастаў дзіўны маленькі інструмент, падобны на дзіцячы гармонік. Пачаў іграць на ім знаёмую мелодыю. Паланез Агінскага. Душэўна, прыгожа. Уяўляю, як здольнасці іграць, спяваць, так лёгка імправізаваць дапамагалі Стоме-акцёру. Нават нямногa пагутарыўшы з гэтым чалавекам, я адчула вялікую сілу ўздзеяння яго таленту. Не верыць яму — немагчыма. Бо робіць усё вельмі шчыра.

Мне хочацца нагадаць тое, пра што сам Здзіслаў Францавіч, сціплы чалавек, не сказаў. За патрыятычную дзейнасць у час Вялікай Айчыннай вайны (шматлікія канцэрты перад байцамі, на прадпрыемствах) артыст З. Стома быў узнагароджаны медалём і ганаровымі граматамі.

— Прыгадваючы найбольш адметныя вашы ролі — Быкоўскага ў «Паўлінцы», Бураўчыка ў «Канстанціне Заслонаве», Лявона з «Лявоніхі на арбіце», Глушака ў «Людзях на балоце», Епіходава ў «Вішнёвым садзе», Белагубава ў «Даходным месцы», Бенволіо ў «Рамэо і Джульеце», я хачу папытацца, як вам працавалася над такімі рознымі, зусім непадобнымі ролямі?

— Мне было лягчэй стварыць вобраз дзеда Савося, дзядзькі Лявона або Глушака. Скажу чаму. Гэтыя людзі мне зразумелыя. Такія навокал мяне — знаёмыя, незнаёмыя, блізкія мне па духу беларусы. Складаней было з рускай і замежнай класікай. Вобразы спасцігаў не толькі пачуццём, але і разуменнем. Працаваў доўга, уперта. Дарэчы, гледачу судзіць.

Адзначу, што З. Стома, які атрымаў выдатную школу акцёрскага майстэрства ў Е. Міровіча, Б. Платонава, Г. Глебава, ішоў у мастацтва сваім шляхам, ніколі не падрабляючыся пад вялікіх і прызнаных. У тэатр ён прыйшоў даволі маладым чалавекам, але з ярка акрэсленай грамадзянскай пазіцыяй, пэўным працоўным вопытам — не толькі каб проста панаваць на сцэне ў бляску свайго майстэрства, але каб і змагацца са сцэны за лепшае ў чалавеку. Акцёр, народжаны новым ладам жыцця, стварае на сцэне розныя вобразы, дакладна акрэсліваючы іх сацыяльную сутнасць. З. Стома працуе вельмі многа, аддаючы ўсяго сябе тэатру. Віртуознае майстэрства, творчая і грамадзянская прынцыповасць вылучаюць яго ў лік вядучых беларускіх акцёраў. Яго выбіраюць сакратаром партыйнага камітэта тэатра, ён дэпутат Вярхоўнага Савета БССР. Нягледзячы на сваю, здавалася б, поўную занятасць, Здзіслаў Францавіч па вечарах займаецца з моладдзю ў самадзейных гуртках, ставіць з імі спектаклі, дзеліцца набытым вопытам. Сваім жыццём, працай ён нібы імкнецца зрабіць усё тое, аб чым толькі марылася яго бацьку. За сябе, і за бацьку.

— Вы так цікава расказваеце пра тэатр, акцёраў, п'есы, гледачоў, і мне ўяўляецца, што жыццё артыста — гэта бясконцае свята, прыемныя хваляванні, кветкі...

— Мастацтва наогул — нялёгкі хлеб. Вельмі няпросты быў і мой шлях на сцэну. Але мне так хацелася быць акцёрам: хваляваць, смяшыць, прымушаць задумвацца гледачоў. Доўгі час я быў на эпізадычных ролях. Сур'ёзна ставіўся да іх: шукаў у кожным чалавечым характары нешта адметнае. Да поту, да знямогі працаваў. Былі ўзлёты, было і расчараванне... Але ж тэатр так і застаўся для мяне святам, радасцю.

Калі б не ведала дакладна, то, мусіць, ніколі не сказала б, што сёлета гэтаму чалавеку, вельмі падцягнутаму, вясёламу —у цудоўнай форме!—ужо 75. Пра такіх гавораць: яму толькі 75! Ён поўны жыццёвых планаў, творчых задум.

— Як гэта ў вас так атрымліваецца, Здзіслаў Францавіч? Падзяліцеся сакрэтам свайго аптымізму, душэўнай маладосці.

— А сакрэт ёсць. Нават жонка, калі я быў маладзейшы (цяпер то ўжо не), казала: «Ты, Здзіслаў, несур'ёзны: паўсюль знойдзеш што-небудзь смешнае, рагочаш, як малы». Такі, відаць, я нарадзіўся. Усе знаёмыя ведаюць мяне як вясёлага, няўрымслівага чалавека. Я з тых аптымістаў, якія часцей бачаць у жыцці добрае, прыгожае і... трошкі смешнае. А ўсмешка—так і ўрачы гавораць —падоўжвае жыццё. Праўду я кажу?

— Дзякую вам, Здзіслаў Францавіч. І ад імя чытачоў нашай газеты віншую з днём нараджэння.

Інтэрв'ю ўзяла Таццяна АНТОНАВА.

НА ЗДЫМКАХ: Здзіслаў СТОМА, народны артыст СССР; З. Стома ў ролях пана Быкоўскага («Паўлінка» Я. Купалы), Лявона («Лявоніха на арбіце» А. Макаёнка) і Арлекіна («Ілгун» К. Гальдоні).

ЛЕТАПІСЕЦ І ЎДЗЕЛЬНІК ПАДЗЕЙ

ДА 75-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ ЭДУАРДА САМУЙЛЁНКА

Пачынаў 21-гадовы Э. Самуйлёнак з вершаў, але ўжо ў наступным, 1929 годзе, ён апублікаваў на старонках газеты «Чырвоная Полаччына» першае сваё апавяданне. За дзесяць год творчай дзейнасці пісьменнік выпусціў пяць кніг прозы. Паводле аповесці «Тэорыя Каленбрун» была напісана п'еса, пастаўленая ў 1935 годзе. Пазней, у 1939 годзе, была напісана і пастаўлена п'еса «Пагібель воўка».

Працуючы ў «Чырвонай Полаччыне», а потым у «Літаратуры і мастацтве» (1934—1939), пісьменнік быў пастаянна ў гушчыні жыцця, непасрэдна браў удзел у калектывізацыі і ажыццяўленні культурнай рэвалюцыі. Гэта не магло не адбіцца і на тэматыцы яго не толькі журналісцкіх, але і літаратурна-мастацкіх твораў. Так, у апавяданнях «Абухам у лоб» і «Русалчыны сцежкі» Э. Самуйлёнак «па гарачых слядах» піша пра цяжкі працэс ломкі старых адносін у вёсцы. І сёння «Русалчыны сцежкі» чытаюцца з цікавасцю. Паэтызацыя новага чалавека, чалавека калектывісцкага, — у шырока вядомай маленькай аповесці «Паляўнічае шчасце».

Э. Самуйлёнак быў у шэрагу дзеячаў літаратуры і мастацтва, якія актыўна змагаліся супраць фашызму і пагрозы вайны. Пра гэта сведчаць яго творы «Тэорыя Каленбрун», «Герой нацыі», «Сустрэча», «Ураччыстая меса».

Асаблівае месца ў творчай спадчыне Э. Самуйлёнка займае раман «Будучыня», прысвечаны рэвалюцыйным падзеям 1918—1921 гадоў у Грузіі. Была напісана толькі першая кніга рамана.

Завяршыць працу над раманам і іншымі творамі пісьменніку не дала заўчасная смерць (1939 год). Народны паэт Беларусі Якуб Колас пісаў: «Ён толькі ступіў на парог свайго пісьменніцкага поўдзеня». Гэтую думку падтрымліваў і Кузьма Чорны: «Апошнімі гадамі ён усё больш уваходзіў у сферу сваіх літаратурных замыслаў — так прыйшла яго творчая спеласць і сталасць. Гэта быў талент, які многа зрабіў бы для нашай літаратуры».

ДАР МУЗЕЮ

Фонды Літаратурнага музея Якуба Коласа папоўніліся новымі цікавымі ўспамінамі пра народнага песняра. Іх перадала дачка вядомага беларускага пісьменніка Максіма Гарэцкага Галіна Гарэцкая. Яна расказвае пра захапленне свайго бацькі творчасцю Якуба Коласа, пра яго сустрэчы з класікам беларускай літаратуры.

У НАШАЙ КРАІНЕ МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА ВЫДАЕЦЦА НА 77 МОВАХ НАЦЫЙ І НАРОДНАСЦЕЙ

АДЗІНЫ АРГАНІЗМ

КАРЭСПАНДЭНТ АДН ГУТАРЫЦЬ З САКРАТАРОМ ПРАЎЛЕННЯ САЮЗУ ПІСЬМЕННІКАЎ СССР ЮРЫЕМ СУРАЎЦАВЫМ АБ СВОЕАСАБЛІВАСЦІ САВЕЦКАЙ МНОГАНАЦЫЯНАЛЬНАЙ ЛІТАРАТУРЫ.

— У Савецкім Саюзе мастацкая літаратура ствараецца і выдаецца на 77 мовах нацый і народнасцей. Які ў такім выпадку сэнс укладваецца ў паняцце «адзіная савецкая літаратура»?

— Мне гэта ўяўляецца так. Савецкая многанацыянальная літаратура — не канглямерат, не сума нацыянальных літаратур, а пэўная культурная агульнасць, настолькі ўнутрана згуртаваная, што зусім правамерна гаварыць іменна аб адзінай многанацыянальнай літаратуры.

Літаратурныя супольнасці — не навіна ў гісторыі культуры. Эліністычная літаратура, напрыклад, стваралася зусім не аднымі толькі грэкамі. Культуры лацінскай пісьменнасці або «мусульманскай» цывілізацыі ў сярэдневякоўі ўключалі ў сябе творы аўтараў, якія належалі да розных народаў. Ды і такое паняцце, як, напрыклад, «еўрапейскі рамантычны рух», — зусім не плён вучоных роздумаў, а літаратурна-культурная рэальнасць.

Але вось такой агульнасці, як літаратура нашых савецкіх народаў, у гісторыі не было. Яна і магла ўзнікнуць толькі ў многанацыянальнай краіне на аснове сацыялістычных грамадскіх адносін і новай па тыпу культуры.

Зразумела, адзінства нашай многанацыянальнай літаратуры склалася не адразу: скажам, у 20-30 гады «адбываўся этап» узаемазнаёмства і паступовага выраўноўвання ўзроўняў культурных станаў у літаратурах розных народаў; гады Вялікай Айчыннай вайны — гэта праверка і загартоўка дружбы народаў і культур. Цяпер мы гаворым аб новым этапе адзінства. Яно не мае нічога агульнага з нівеліроўкай або «русіфікацыяй» культур, аб чым любяць пагаварыць некаторыя нашы замежныя заслеціўцы. Неперадузятае чытанне твораў такіх вядомых і на Захадзе пісьменнікаў, як, скажам, рускія Юрый Бондараў, Юрый Трыфанаў, Васіль Бялоў, літовец Міколас Слуцкіс, грузін Надар Думбадзе, кіргіз Чынгіз Айтматаў, аварац Расул Гамзатаў, ясней за іншыя тэарэтычныя меркаванні паказа, што ніякай нівеліроўкі — ні індывідуальнай, ні нацыянальнай — у нашай літаратуры няма і што інтэрнацыянальнае адзінства гуманістычнага пафасу зусім не перашкаджае праяўляцца і развівацца нацыянальным традыцыям.

— Але якія адносіны інтэрнацыянальнага і нацыянальна-спецыфічнага ў савецкай літаратуры? Ці ёсць у гэтым «адзіным арганізме» адно, агульнае эстэтычнае «сэрца»?

— У літаратуры, як і ў любой мастацкай творчасці, галоўнае — гэта страсць мастака, аўтарскі пафас, праяўленне яго асобы ў жаданні сказаць сваім мастацтвам нешта неабходнае людзям. У накіраванасці гэтых жаданняў, у імкненні да дабра і прыгажосці сыходзяцца савецкія пісьменнікі ўсіх нацыяльнасцей і індывідуальнасцей. — іх сэрцы б'юцца ва ўнісон.

Зразумела, эстэтычна гэта адзінства ажыццяўляецца сугуба індывідуальна: сапраўднае мастацтва не церпіць стандарту.

Савецкі вопыт паказаў: эстэтычныя заваёвы (традыцыі) аднаго народа здольны стаць блізкімі іншым народам. Гэтыя працэсы ўзаемаўзбагачэння ўвесь час набіраюць сілу. Ствараецца агульная скарбніца, агульны арсенал, і яго пашыраюць усе. І кожны па-свойму.

Як сённяшні савецкі народ этнічна многанацыянальны і культурна разнастайны, так і літаратура эстэтычна шматгранная — уся ў цэлым савецкая літаратура і кожная нацыянальная. Яшчэ раз падкрэслю: рост кожнай нацыянальнай літаратуры — няхай гэта будуць такія старадаўнія, з тысячагадовай гісторыяй, як, скажам, армянская ці руская, або «новаеўрапейскія», якія налічваюць па два-тры стагоддзі гісторыі, як, напрыклад, эстонская або беларуская, ці, нарэшце, так званыя «новапісьменныя», гэта значыць тыя, якія толькі ў савецкі час распрацавалі сваю ўласную пісьменнасць, а да таго абыходзіліся фальклорам, як, напрыклад, кіргізская або башкірская, — рост кожнай адбываецца за лік сваіх нацыянальных талентаў, але з апорай цяпер ужо на ўвесь агульнасаюзны эстэтычны, мастацкі вопыт.

Ці супярэчыць нацыянальнае інтэрнацыянальнаму ў сацыялістычных культурах? Ніколькі. Наадварот, абапіраючыся на гэта інтэрнацыянальнае — кардынальнае, агульнацікавае, агульнапазнавальнае ў нацыянальнай культуры, пісьменнік выказвае яго па-свойму, згодна са сваімі нацыянальнымі традыцыямі.

— Замежнаму чытачу павінна быць вядома, што такія класікі рускай літаратуры, як Максім Горкі, Аляксандр Блок, Уладзімір Маякоўскі, у значнай меры вызначылі шляхі станаўлення маладой савецкай літаратуры. Ці можна цяпер назваць пісьменнікаў, чыя творчасць вызначае аблічча кожнай з нацыянальных літаратур і савецкай літаратуры ў цэлым? Іншымі словамі, ці існуе, на ваш погляд, паняцце «савецкая класіка»?

— Безумоўна, існуе. І савецкая класіка — таксама агульны здабытак народаў. Прычым савецкі класік захоўвае ўсе нацыянальныя рысы. Маякоўскі — рускі савецкі паэт-класік, Тычына — украінскі, Мухтар Ауэзаў — казахскі... Сёлета літаратурная грамадскасць шырока адзначае юбілеі: эстонца Юхана Смуула, рускага Канстанціна Федзіна, беларусаў Янкі Купалы і Якуба Коласа. Усё гэта — агульны здабытак савецкай культуры.

Бяссмерце пісьменніку, як вядома, дорыць час, але ўжо сёння мы можам уявіць, да каго ён будзе міласцівым. Думаю, что ў гэтым шэрагу будуць і кіргіз Чынгіз Айтматаў, і літовец Юсцінас Марцінкявічус, і аварац Расул Гамзатаў...

МЕРЫДЫЯНЫ АДАМА МАЛЬДЗІСА

Яго творчасць даўно стала адметнай з'явай культуры Беларусі. Нават па першых публікацыях, якія з'явіліся больш за чвэрць стагоддзя назад, у ім угадваўся чалавек з рамантычнай захопленасцю, з уменнем сказаць новае, асэнсаваць вядомае. І ўсё гэта без паказухі, непатрэбных эфектаў. Кожная публікацыя Адама Мальдзіса вызначаецца глыбінёй думкі, аргументаванасцю, адметнасцю стылю.

Поле яго дзейнасці сапраўды шырокае: літаратуразнаўства, крыніцазнаўства, мастацтвазнаўства, краязнаўства, фалькларыстыка, этнаграфія... А яшчэ ён перакладчык з розных моў на беларускую.

Адама Мальдзіса па праву называюць і энцыклапедыстам: для БелСЭ ім напісаны дзесяткі праблемных артыкулаў. Надзвычай універсальныя яго веды. І дасягнуў гэтага вучоны, думаецца, таму, што ўмее разумна спланаваць свой дзень, тыдзень, месяц, год... Безупынна папаўняе свае веды і гэтак жа шчодра дзеліцца імі з людзьмі. Праца ў архівах, бібліятэках, музеях. Сустрэчы з калегамі, з жывымі сведкамі падзей, рэдагаванне кніг, лекцыі, выступленні на абаронах дысертацый, на пасяджэннях таварыстваў кнігалюбаў і таварыства аховы помнікаў... Ніколі рукамі не разводзіць, што няма часу.

Адам Іосіфавіч — чалавек шчодрай душы. І калі ўжо хваліцца, то не за сваё ўласнае, а за грамадскае, агульнае, людское. Няма ў яго і такой здраднівай чалавечай слабасці, як зайздрасць. Наадварот, ён шчыра радуецца поспехам сяброў, знаёмых, падтрымлівае пачынаючых літаратараў, навукоўцаў, дапамагае ўсім, хто звяртаецца да яго.

Кнігі А. Мальдзіса добра знаёмы нашаму чытачу, не залежваюцца на паліцах кнігарань і бібліятэк; хай гэта будзе «Творчае пабрацімства» — пра беларуска-польскія літаратурныя сувязі, ці «Падарожжа ў XIX стагоддзе», дзе знаходзім цікавыя звесткі пра тагачасную беларускую літаратуру, музыку, мастацтва, або «Таямніца старажытных сховішчаў» — пра знаходкі помнікаў беларускай літаратуры, пра цікавыя сустрэчы на польскай зямлі, пра падарожжы па Беларусі. І ўжо зусім па-свежаму ў нашым літаратуразнаўстве чытаецца манаграфія «На скрыжаванні славянскіх традыцый», якая запоўніла сабой вялікія прагалы пераходнага перыяду ў літаратурным працэсе XVII—XVIII стагоддзяў. Вельмі магчыма, што і праца Адама Мальдзіса не «апошняя інстанцыя» ў гэтай справе, але ён першы так рашуча ўзяўся за яе вырашэнне.

Сваёй працай А. Мальдзіс яшчэ раз даказаў, што значыць быць да канца паслядоўным, праяўляць даследчыцкую кампетэнтнасць, адкрываць там, дзе, здаецца, няма ўжо ніякай надзеі на адкрыццё. А ён не толькі расставіў «верставыя слупы» літаратурнага працэсу, але і запоўніў прастору паміж імі новымі невядомымі творамі, фактамі гісторыі і г. д. З захапленнем чытаюцца напісаныя А. Мальдзісам раздзелы «Гісторыі беларускай літаратуры дакастрычніцкага перыяду», а таксама вялікія раздзелы ў калектыўных працах, якія прысвечаны розным праблемам гісторыяграфіі роднай літаратуры. Ён па праву атрымаў званне лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР імя Якуба Коласа.

Даводзіцца толькі здзіўляцца вялікай працаздольнасці Адама Іосіфавіча, калі ўявіць, што паралельна з усёй даследчыцкай працай ён пісаў кнігу «Шляхі вялі праз Беларусь» (сумесна з Валянцінам Грыцкевічам), вандраваў па Беларусі, збіраў звесткі пра літаратурныя мясціны для новай кнігі. Рэдагаваў кнігу фальклору народнай спявачкі з Маладзечаншчыны Зосі Зянько-Пачакоўскай (1892—1977), якая наспявала каля 300 тэкстаў розных вуснапаэтычных твораў. Зрэшты, Маладзечаншчына даўно мае сваю прывабнасць для вучонага, бо А. Мальдзіс тут пачынаў работу адказным сакратаром радашковіцкай газеты «Сцяг Ільіча». Пачынаў тут займацца краязнаўствам, якое заняло вялікае месца ў творчай біяграфіі пісьменніка. Варта прыгадаць яго кнігу «Астравеччына, край дарагі...», каб зразумець яго прывязанасць да дарагіх з дзяцінства мясцін.

Юбілей (пісьменніку споўнілася 50) застаў Адама Мальдзіса ў творчай дарозе, калі яшчэ хочацца марыць і пісаць, сустракацца з сябрамі. Верым у яго новыя кнігі, падарожжы... Хай усё збудзецца.

Генадзь КАХАНОЎСКІ.

У ВЁСЦЫ ЛОЛІКАВА СТВОРАНЫ ФАЛЬКЛОРНЫ ХОР

ПРА ЖЫЦЦЁ ДАЎНЕЙШАЕ І ЦЯПЕРАШНЯЕ

Наваколле вёскі Лолікава, што ў Кобрынскім раёне, багата на цудоўныя куточкі — векавыя бары, няхуткая рачулка, сонечныя лугі. Усё гэта хараство з маленства акружае вяскоўцаў. А разам з маляўнічай прыродай акружае тутэйшых жыхароў і народнае мастацтва. Мноства старадаўніх песень, якія на працягу трох стагоддзяў — столькі існуе вёска — захавалася тут. Мясцовыя жыхары стварылі свой вясковы хор, які працуе ўжо некалькі гадоў. Самадзейныя артысты спяваюць пра родную вёску, пра сялянскую працу, ну і, вядома ж, пра каханне. «З песнямі, — гаворыць адзін з удзельнікаў хору Мікола Трубчык, — мы нараджаемся і жывём. Песня з намі заўсёды: і калі весела, і калі сумна».

У лолікаўскім хоры — амаль 30 чалавек. Гэта даяркі, механізатары, каняводы, сельская інтэлігенцыя. Спяваюць нават цэлымі сем'ямі. З першых дзён, напрыклад, у хор ходзяць сёстры Вераніка, Наста, Кацярына і Ганна Казлей, Марыля Марашчук, Наста і Вераніка Сакадзіны, Еўдакія Гуглук і многія іншыя.

І добра ж спяваюць жанчыны! Іх спеў зачароўвае, ім заслухоўваешся. Нездарма лолікаўскі хор добра ведаюць жыхары навакольных вёсак. Калектыў — лаўрэат некалькіх абласных аглядаў мастацкай самадзейнасці.

Адным з ініцыятараў стварэння хору быў загадчык мясцовага клуба Пятрусь Шэпацюк. Ён добра ведаў цягу аднавяскоўцаў да народнай песні, сам любіў спяваць. Пагаварыў з сябрамі, суседзямі — згадзіліся. Але спяваць хорам прыгожа і зладжана — справа нялёгкая. Таму вырашыў Пятрусь Шэпацюк параіцца з якім-небудзь спецыялістам. Ім аказаўся знаўца і аматар харавых спеваў, заслужаны работнік культуры БССР Ігар Чэрнік. Сустрэча двух аднадумцаў і паклала пачатак лолікаўскаму фальклорнаму хору. Было гэта ў 1972 годзе.

Успамінае Ігар Чэрнік:

— У той час я працаваў дырэктарам Кобрынскага раённага Дома культуры і кіраваў мясцовым народным хорам. Звяртаецца да мяне загадчык лолікаўскага клуба Пятрусь Шэпацюк... Неўзабаве збіраем людзей на першую рэпетыцыю. Прыйшлі дружна і мужчыны, і жанчыны. Пачалі спяваць свае песні. З імі хор выступіў на аглядзе сельскай мастацкай самадзейнасці і стаў лаўрэатам агляду.

Самадзейныя спевакі часта выступаюць з канцэртамі. І дзе б яны ні дэманстравалі майстэрства, іх паўсюль прымаюць цёпла і радасна. Красамоўным пацвярджэннем высокага выканаўчага ўзроўню калектыву з'яўляецца і тое, што хор меў гонар прадстаўляць беларускае фальклорнае мастацтва на I Усесаюзным фестывалі мастацкай самадзейнасці працоўных і стаў яго дыпламантам.

Калектыў сябруе і спаборнічае з Ратнаўскім раёнам Валынскай вобласці Украінскай ССР. Неаднаразова выступаў у горадзе Ратна, у вёсцы Самары і іншых мясцінах перад украінскімі сябрамі.

Бачыць лолікаўскі хор на сцэне надзвычай прыемна: натхнёныя твары, звонкія галасы, прыгожыя сцэнічныя ўборы. Дарэчы, касцюмы самадзейных артыстаў зроблены рукамі вясковых жанчын. Андаракі, прыгожа аздобленыя беларускім арнаментам кашулі, квяцістыя хусткі, фартухі.

Заслугоўвае ўвагі і яшчэ адна старонка творчай дзейнасці лолікаўскіх спевакоў — нястомнае збіранне і захаванне старажытных беларускіх песень. Адну з іх — «Паншчына», у якой пяецца пра цяжкую паднявольную працу беларускага селяніна, выконваюць з асаблівым пачуццём, бо яна пра колішняе нялёгкае жыццё іх дзядоў і бацькоў.

Мноства песень ведаюць лолікаўцы — вясёлых і жартоўных, сумных і журботных. Слухаеш іх — і поўніцца сэрца цеплынёй, любоўю, гонарам за сваю родную зямлю, за яе таленавітых людзей.

В. ТРАМБІЦКАЯ.

СМЕЛЫ ВЕРАБЕЙЧЫК

Ён вываліўся з гнязда. Дакладней сказаць, не вываліўся, проста малады верабейчык вырашыў упершыню адправіцца ў самастойны палёт, паспытаць яго асалоду. Але слабыя пакуль крылы не трымалі яго ў паветры, і ён, адчайна трапечучы імі, далей плоту адляцець не змог. Там ён забіўся ў пякучку-крапіву і спалохана заціх.

Я вырашыў паназіраць: што ж будзе рабіць гэтае смелае птушаня.

Знікненне дзіцяці старыя вераб'і заўважылі адразу. Можа яны пачулі спалоханае ціўканне з-пад плоту ці сачылі за яго першым вылетам. Бацькі адразу замітусіліся. Адчайна загаласілі, бесперапынна пералятаючы з плоту на грушу, з грушы на суседнюю яблыню. Здавалася, яны просяць малога: «Хавайся! Хавайся! Вунь кот-злодзей бадзяецца, ды сабакі злыя па вуліцы бегаюць! Хавайся! Хавайся!».

Якое ж было маё здзіўленне, калі малы, не звяртаючы аніякай увагі на паніку бацькоў, храбра выбраўся з крапівы і ўтаропіўся на мяне сваімі цікаўнымі вочкамі. Я не варушыўся. Тады верабейчык, быццам робячы мне выклік, шырока адкрыў сваю яшчэ жоўтую дзюбку і голасна чырыкнуў. Атрымалася так задзірыста і смела, што я засмяяўся. Чалавечы голас ніколькі не спалохаў птушаня. Наадварот, яно рашуча заскакала па двары, заглядваючы ва ўсе куткі! Нішто яго не палохала: ні стары певень, што паважна, як сапраўдны гаспадар, хадзіў побач, ні шум машын і трактароў. Напэўна ён яшчэ не ведаў, што такое небяспека, і таму быў такі смелы.

На сонейку, якраз у цэнтры падворку, стаяў транзістар. Вакол яго ўжо даўно мітусіліся чатыры кацяняты, зусім яшчэ маленькія. Ледзь трымаючыся на нагах, яны ўжо спрабавалі гуляць, тузаць адно аднаго. Прыёмнік ім так спадабаўся, што кацяняты то ўзбіраліся на яго, то бегалі вакол, ціха папіскваючы ад задавальнення. Старой кошкі побач не было, і малыя адчувалі сябе вольна.

Верабейчык раптам рашуча паскакаў да кацянят. Відаць, вясёлая кампанія спадабалася яму.

Старыя вераб'і быццам ашалелі. Яны насіліся над самай галавой птушанятаў, здавалася, хацелі адкінуць яго назад, далей ад гэтых страшных катоў, адвечных ворагаў вераб'інага племя.

Кацяняты заўважылі «госця». Спынілі гульню. Ніякай варожасці ў іх вачах не было. Толькі цікавасць.

Верабейчык паводзіў сябе як гаспадар. Ён ускочыў на ручку прыёмніка і прыціх, быццам заслухаўся мелодыяй, што чулася з дынаміка.

Кацяняты яшчэ больш зацікавіліся няпрошаным госцем, захадзілі вакол птушанятаў. Самы смелы, напэўна, вырашыў, што час пазнаёміцца бліжэй, забраўся на прыёмнік, пацягнуўся мордачкай да незнаёмца.

Я памкнуўся ўжо ўскочыць і ратаваць вераб'я, але трывога мая была дарэмнай. Малыя мірна сядзелі побач.

Старыя вераб'і, відаць, страцілі ўсялякую надзею на выратаванне свайго дзіцяці. Яны ўжо не лёталі, а толькі гучна, на ўсю вуліцу крычалі.

Пачуўшы птушыны вэрхал, на вуліцу выйшла гаспадыня хаты. Яна заўважыла незвычайную кампанію і здзівілася: «Ой! Што ж гэта! Зусім ручны верабейчык! Пасябравалі!» І, не звяртаючы ўвагі на мае перасцярогі, падышла да прыёмніка, працягнула руку да вераб'я. Той быццам бы гэтага і чакаў: узмахнуў крыламі і пераскочыў на палец.

Мы здзіўляліся. А верабей, зручней усеўшыся, гучна зачырыкаў.

Васіль ЖУШМА.

НА ЗДЫМКАХ: смелы верабейчык; слухаюць музыку.

Спорт

ТРЫ МЕДАЛІ ПАРФЯНОВІЧА

Да перамог выдатнага беларускага весляра Уладзіміра Парфяновіча ўсе прывыклі ўжо. Некалькі гадоў запар не ведае ён паражэнняў.

Вось і на нядаўнім першынстве свету наш спартсмен заваяваў тры залатыя медалі. Спачатку Уладзімір Парфяновіч у пары з Сяргеем Суператам з Украіны перамог на дыстанцыі 1 000 метраў, а пасля з ім жа быў мацнейшым у саперніцтве байдарак-двоек на паўкіламетровай дыстанцыі, і на байдарцы-адзіночцы на 500 метраў.

Тры залатыя ўзнагароды беларускага весляра ў многім дапамаглі камандзе СССР заняць першае месца ў агульным заліку чэмпіяната свету.

НА ПЕРШЫНСТВЕ ЕЎРОПЫ

Пяць залатых, тры сярэбраныя і два бронзавыя медалі заваявалі савецкія воднялыжнікі на першынстве Еўропы, якое завяршылася ў Швецыі.

Званні абсалютнага чэмпіёна кантынента ўдастоены Генадзь Важнік з Мінска. Ён быў мацнейшым у фігурным катанні. Вызначылася і яго зямлячка — Алена Мазоўка, якая перамагла ў фігурным катанні і заняла другое месца ў многабор'і.

У СКАРБОНКУ ЗБОРНАЙ

Дзюдаісты СССР, як і зборная Японіі, заваявалі тры вышэйшыя ўзнагароды на першынстве свету сярод студэнтаў, што прайшло ў Фінляндыі.

Удала выступіў тут мінчанін Вячаслаў Сянкевіч. У скарбонку зборнай СССР ён «паклаў» сярэбраны медаль.

ВЫСТУПІЛІ ПАСПЯХОВА

У невялікім чэхаславацкім горадзе Алексковіцы прайшлі традыцыйныя спаборніцтвы воднялыжнікаў сацыялістычных краін на «Кубак Дружбы».

Гонар нашай краіны абаранялі і спартсмены з Наваполацка Юрый Рыкцер і Аляксандр Баярын. Рыкцер заняў трэцяе месца сярод юніёраў у фігурным катанні. А. Баярын стаў сярэбраным прызёрам у скачках з трамплінa.

ГРОСМАЙСТАРСКІ ВЫНІК

На прайшоўшым чэмпіянаце Беларусі па лёгкай атлетыцы — сюрпрызы. Даўно так не радавалі аматараў спорту кідальнікі. Галоўнай жа сенсацыяй стала выступленне кідальніка молата Юрыя Тарасюка з Гродна. Малады спартсмен перамог з гросмайстарскім вынікам — 80 метраў 72 сантыметры, што з'яўляецца новым рэкордам рэспублікі.

ГУЛЯЮЦЬ ФУТБАЛІСТЫ

Чарговыя гульні на першынстве СССР па футболу ў вышэйшай лізе правялі мінскія дынамаўцы. Спачатку яны перамаглі аднаклубнікаў з Тбілісі з лікам 2:0, а пасля была нічыя (1:1) з ерэванскім «Араратам».

Па-ранейшаму «Дынама» (Мінск) займае першае месца ў турнірнай табліцы.

* * *

Пасля перамогі над дынамаўцамі Брэста з лікам 1:0 магілёўскі «Днепр» на чатыры ачкі апярэджвае «Хімік» з Гродна, які займае другое месца сярод каманд другой лігі першынства СССР.



Летні дзень на рацэ Гарынь ля Століна.

Фота Я. БРЫЛЯ.

У вашу калекцыю

«ЖАР-ПТУШКА», «СНЯГУРАЧКА», «БУЛЬБА»... НА МАРКАХ

Далёка за межамі нашай краіны знаўцам і аматарам народнага мастацтва добра вядомы хахламскі і жостаўскі роспісы, палехская і фядоскінская мініяцюра. Некаторыя творы народных умельцаў адлюстраваны на паштовых марках і канвертах нашай краіны.

Міністэрства сувязі СССР нядаўна выпусціла яшчэ дзесяць марак, прысвечаных творчасці старэйшага пакалення палехскіх майстроў, і цяпер філатэлісты могуць любавацца ў сваіх альбомах голікаўскім «Аратым», катухінскай «Жар-птушкай», ватагінскай «Пагулянкай». На іншых марках, надрукаваных на мелаванай паперы з лакавым пакрыццём, паказаны работы І. Бакурава «Перамога», А. Качупалава «Дэман», Т. Зубкова «Снягурачка», К. Кукуліева «Лета». ...Магутны конь з густой грывай цягне плуг, які трымае барадаты стары, фантастычная птушка з прыгожым доўгім пер'ем вырываецца з рук Іванкі, хлопец з дзяўчынай — ён у чырвонай кашулі, яна ў кофце з гарохамі і сіняй спадніцы — танцуюць пад гармонік... Маркі ляжаць у альбоме, і здаецца, што аркушы яго напоўнены сонцам, чароўнай музыкай...

З падобнымі малюнкамі выпушчаны і канверты.

На шасці марках даюцца рэпрадукцыі твораў майстроў народнага промыслу вёскі Фядоскіна, мініяцюры «Пунсовая кветачка», «Казка пра цара Салтана», «Уздоўж па вуліцы»...

Адлюстравана на паштовых знаках багародская разьба па дрэву, хахламскі, жостаўскі роспіс, халмагорская мастацкая разьба па касці, валагодскія карункі. Славутыя жостаўскія падносы паказаны на цэлай серыі паштовых канвертаў. З дымкаўскай і загорскай народнай цацкай, апашнянскай керамікай (Украінская ССР), цісненнем па скуры (Эстонская ССР), кубачынскай апрацоўкай металу (Дагестан) знаёмяць нас некалькі серый марак і канвертаў больш ранніх выпускаў.

Славутыя ўпрыгажэнні з Алмазнага фонду СССР, вырабы з Гжэлі і Дзмітраўскага фарфоравага завода паказаны на марках і канвертах, выдадзеных ў 1966 і 1971 гадах.

Да раздзела марак аб народнай творчасці адносяцца паштовыя выпускі з вельмі маляўнічымі і самабытнымі касцюмамі народаў СССР. У розныя гады савецкая пошта прысвяціла гэтай тэме вялікую колькасць сваіх выпускаў. Яшчэ ў 1933 годзе ўбачыла свет вялікая этнаграфічная серыя марак, што расказвала пра народы і народнасці, якія насяляюць нашу краіну. Усе прадстаўнікі народаў СССР паказаны на марках у сваіх нацыянальных касцюмах. Адна з марак прысвечана беларусам.

У розныя гады савецкая пошта выпусціла мастацкія канверты з малюнкамі беларускіх народных танцаў «Юрачка» і «Бульба». Выканаўцы танцаў на канвертах — таксама ў народных касцюмах.

Л. КОЛАСАЎ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ

НАШ АДРАС:

МІНСК-ГСП, ЛЕНІНСКІ ПРАСПЕКТ, 44.
ТЭЛЕФОНЫ: 33-01-97, 33-02-80, 33-03-15, 33-16-56, 33-07-82.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.
Зак. 1502